## На сцэне

# АДЧУВАННЕ НЕЗВАРОТНАСЦІ

### Што ў сучасным беларускім грамадстве прыводзіць да непапраўных вынікаў

**Новы спектакль «З вучылішча» Аляксандра Марчанкі з выкарыстаннем відэатрансляцый, нецэнзурнай лексікі і шматлікіх адсылак да беларускага навакolля для нашага тэатральнага асяроддзя ўсё яшчэ можна лічыць незвычайным. Таму што ў краіне пануе рэпертуарны тэатр, а «З вучылішча» належыць да праектнага. Таму што паказваецца ён не на сцэне спектакльнага будынка, а ў культурным інкубатары ОК16, дзе апроч імправізаванай сцэны, задзейнічана яшчэ некалькі памяшканняў. Таму што аўтарамі асвойваецца сучасная кінамова і спосабы расказваць гісторыю нелітаральна. І нават таму што новая пастаноўка кожным крокам акцёраў адсылае да актуальнай рэчаіснасці, а гэта не кожны сучасны тэатральны сюжэт гатовы прапанаваць.**



Прэм'ера «З вучылішча» адбылася 6 чэрвеня на пляцоўцы ОК16, дзе яе прадставіў Цэнтр візуальных і выканальніцкіх мастацтваў «Арт Карпарэйшн» у шэрагу іншых мерапрыемстваў праекта «ТАК: Тэатр. Адукацыя. Кіно». Асновай стала п'еса небезвядомага беларускага драматурга Андрэя Іванова, намінаваная на прэстыжную расійскую тэатральную прэмію «Залатая маска».

Аўтар не хавае, што хацеў стварыць трагедыю, роўную антычнай. Адзін з галоўных герояў «З вучылішча» — выкладчык філасофіі, рэквізітам служаць бюсты быццам грэчаскіх філасофаў на пастаментах у выглядзе класічных калон, героі цытуюць аднаго з трох вялікіх трагікаў Сафокла. Да таго ж страсці і жарсці, якія адбываюцца на пляцоўках ОК16, дакладна не належаць звычайнаму жыццю, хоць па ўсіх іншых паказчыках свет спектакля нават больш чым звычайны — альбо гапаваты, альбо смешны ў сваёй нікчэмнасці. І калі пачынаць спачатку, галоўны герой Сяргей выкладае філасофію, але ў так званай «хабзе». Бюсты і калоны ўвесь час выкарыстоўваюцца для самых празаічных мэт і такім чынам здымаюцца з п'едэстала. Месца неаспрэчных грэчаскіх абсалютаў перыядычна займае галоўная гераіня Танька, якая выступае сімвалам і ўвасабленнем «гапаты» — людзей з неўладкаваных сем'яў, з дрэннымі адукацыяй і кругаглядам, адпаведнымі маўленнем і манерамі. Цытаты Сафокла абясцэньваюцца самім асяроддзем выкарыстання.

Атрымліваецца, што спектакль увесь час нівеліое спадчыну, што дасталася нам ад вялікіх, і такім чынам расказвае пра сучаснасць. А ў сучаснасці выкладчык філасофіі Сяргей, што марыць з'ехаць з краіны, каб не бачыць вязаных шапкі з пацеркамі на постсавецкіх жанчынах, звяртаецца да свайго сябра Славіка, які мог бы арганізаваць добры заробак. Прадстаўнік залатой моладзі, сын багацеяў, прыгажун Славік прымушае Сяргея зрабіць стаўку на спакушэнне сваёй студэнткі Танькі... Макбук, аўтамабіль і магчымасць праводзіць варкшопы па філасофіі за добрыя грошы аказаліся на коне.

У сваю чаргу Танька, маці якой памерла, бацька-алкаголік застаўся інвалідам, а хлопец сеў у турму за забойства, мае свае планы і «выбірае» выкладчыка, таму што ён «той самы», а ёй хочацца сям'і, дзяцей і шчасця. Уласна, успрымаць яе выключна як жанчыну не даводзіцца. Хоць у гэтым таксама ёсць сэнс — не тое каб ракавая, але вынаходлівая гераіня падпарадкоўвае сабе навакolле, дзейнічае выключна ў сваіх інтарэсах і дамагаецца мэт. Абодва мужчыны, Сяргей і Косця, што выйшаў з турмы, не могуць ад яе пазбавіцца — ад кахання ці таму, што яна шантажуе і трымае пры сабе сілай.

Здавалася б, чарговы сюжэт пра моцную жанчыну і слабага мужчыну. Праўда, дамінаванне студэнткі хабзы над выкладчыкам філасофіі глядзіцца эксцэнтрычна і сімвалічна. Галоўны герой, вакол якога ўвесь час абрынаюцца бюсты грэчаскіх класікаў, падпарадкоўваецца нейкай агульнай дэградацыі (сімвалам якой у пэўным сэнсе з'яўляецца Танька) і ад яе ж марыць збегчы. З пасткі, у якую ён трапіў, спачатку з-за свайго беспрынцыповага сябра, які не ведае, якім яшчэ чынам можна атрымаць новыя эмоцыі, а потым з-за гапаватай, але прынцыповай дзяўчыны, выхад толькі адзін, прычым сапраўды трагічны.

Калі пачынаеш збіраць элементы спектакля, мазаіка паказвае, што для сучаснага чалавека якасць і маштаб сапраўднай трагедыі зрушыліся — канешне, неахопныя грэчаскія пакуты ў параўнанне не ідуць, але на тое ён і зменлівы свет, каб прапанаваць нешта новае. Дык вось, «грэчаская трагедыя» сучаснай Беларусі — у п'янстве, слабасці духу, прынцыпах «гапаты» і абыякавасці. Адразу некалькі падзей, што прыводзяць да незваротных вынікаў, адбываюцца з-за нецвярозасці. Галоўны герой падпадае пад уздзеянне двух чалавек з-за сваіх сляпых жаданняў, а выкараскацца яму не даюць дзіўныя — заўсёды варыянтныя — прынцыпы іншых персанажаў.

Трэба сказаць, «З вучылішча» здолела паказаць адзін з галоўных складнікаў велічыні сафоклаўскіх трагедый — разуменне незваротнасці, якая датычыцца і нашага навакolля, хоць звычайна яго стабільнасць цягне на драму і толькі. Рэчаіснасць з яе стылымі сценамі, дзе кожны шлях развіцця аказваецца тупіковым, зацягвае ў нейкую бесперспектыўную багну. Кім бы ў гэтым сюжэце ты ні быў, багатым альбо не, прынцыповым альбо без прынцыпаў, каханым альбо тым, хто прымае каханне, — шчаслівым ты не станеш.

Апроч выдатнай п'есы, дзе праз залатую моладзь, гопнікаў і героя, што марыць пра Еўропу, разыгрываецца трагедыя нашай сучаснасці, пастаноўка можа пахваліцца і рэжысурай. Умела Аляксандр Марчанка выкарыстаў прастору — спектакль без антракта дзякуючы рухомай камеры адбываецца на некалькіх пляцоўках і ў некалькіх антуражах. Экран у сваю чаргу не абмяжоўваўся тэхнічнай функцыяй — перадачай працягу дзеяння, якое мы не можам бачыць фізічна. Разам з гэтым ён дэталюе тое, што адбываецца літаральна перад гледачамі, і акцэнтуе ўвагу на пэўных рэчах, ствараючы новыя сэнсы. Паказвае сімвалы, перапіску ў месенджары ці іншыя знакавыя рэчы кшталту цытат. У цэлым рэсурсы культурнага інкубатара і яго архітэктуры, тэхнікі, мінімалісцкага рэквізіту выкарыстаныя такім чынам, што падчас пастаноўкі не даводзіцца сумаваць. Кожная змена дэкарацый, некалькі пунктаў гледжання на адну і тую ж сцэну, гучны саўндтрэк «Я не цацка» трымаюць увагу ад пачатку да канца, у тым ліку таму, што значэнні ледзь не кожнай сцэны можна разбіраць асобна як палатно.

> Падкупае і тое, што трагедыя разыгрываецца не на адасобленай сцэне, а на адлегласці выцягнутай рукі — ты глядзіш на герояў зверху ўніз, Славік садзіцца ў залу для гледачоў і прамаўляе рэплікі са свайго месца, можна разабраць размову з суседняга пакоя, калі трансляцыя перастае перадаваць гук.

Новая пастаноўка — з належнай інтанацыяй, з дрыжаннем у голасе, з буйнымі планамі акцёраў на экране — дакладна трапляе ў шэраг рэкамендацый. Галоўны герой з трагічна апушчанымі бровамі перадасць прывітанне з Еўропы, але ці збег ён такім чынам ад вязаных шапак з пацеркамі — яшчэ пытанне.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ**

## Творчае падарожжа

# Каледж мастацтваў шукае таленты

### Новы праект дапаможа знайсці найлепшых навучэнцаў музыкальных і мастацкіх класаў

**Выкладчыкі Гімназіі-каледжа мастацтваў імя Івана Ахрэмчыка наведалі ўжо каля дваццаці гарадоў і вёсак у межах праекта «Мы — для дзяцей!». Яны праводзяць майстар-класы для настаўнікаў, бацькоў і ў прыватнасці для адораных школьнікаў, што займаюцца музыкай і выяўленчым мастацтвам. Вынікам вандровак становіцца банк даных таленавітых дзяцей, выстаўкі і канцэрты. Ініцыятарам праекта стаў дырэктар каледжа, кандыдат педагагічных навук Міхаіл Пазднікаў, а калектыў — вядомыя музыканты, мастакі, выдатныя педагогі — яго падтрымаў.**

У творчым дыялогу з дзецьмі выяўляюць тых, хто мог бы ўдасканаліць свае навыкі і паступіць у Гімназію-каледж мастацтваў, дзе ўжо сёння вучацца музыканты (з 2 класа) і мастакі (з 5 класа) з розных куткоў краіны. У выніку на карту арганізатараў трапілі Лагойск, Слуцк, Светлагорск, Астрашыцкі Гарадок і яшчэ шэраг гарадоў і мястэчак. На месцы праходзяць таксама сустрэчы з гарадскім і раённым кіраўніцтвам, заключаюцца дагаворы аб творчым супрацоўніцтве.

У канцы мая, напрыклад, выкладчыкі наведалі Узду. Старшыня Уздзенскага райвыканкама Сяргей Савіцкі ацаніў вынікі творчых сустрэч і майстар-класаў, якія выкладчыкі правялі па фартэпіяна, духавых інструментах, сальфеджыа, хоры, скульптуры і жывапісе. А Міхаіл Пазднікаў падкрэсліў: каб уславіць малую радзіму, трэба стаць сапраўдным прафесіяналам. Такім, як, напрыклад, нядаўні выхаванец заслужанага настаўніка Беларусі Таццяны Сергіеўскай, пераможца міжнародных конкурсаў, добра вядомы ў Еўропе піяніст Дзяніс Лінік. Альбо лаўрэаты Нацыянальнай прэміі ў галіне выяўленчага мастацтва Рыгор Сітніца, які ў свой час прыехаў вучыцца ў Мінск з Петрыкаўскага раёна, Глеб Отчык з Гомеля, Паліна Пірагова і Васіль Цімашоў з Наваполацка.

За апошнія гады больш за сто навучэнцаў каледжа сталі стыпендыятамі, лаўрэатамі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Навучальная ўстанова ператвараецца ў метадычны актыў, дзе распрацоўваюцца вучэбныя праграмы, а выкладчыкі дапамагаюць дзецям засвойваць не толькі спецыяльныя прадметы, але і агульнаадукацыйныя.

Тым часам у нашай сталіцы і іншых гарадах з'яўляюцца новыя адрасы, дзе можна ўбачыць творы выпускнікоў Гімназіі-каледжа мастацтваў імя Івана Ахрэмчыка. Каля Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь — помнік Францыску Скарыну Алеся Дранца. Мазаіку Храма Усіх Святых, інтэр'ераў Савета Рэспублікі рабіла група выпускнікоў пад кіраўніцтвам Дзяніса Чубукова і Юрыя Пеўнева... Сюды ж трэба ўключыць работы Рыгора Сітніцы, Уладзіміра Вішнеўскага, Уладзіміра Савіча, Святланы Гарбуновай, Паліны Піраговай і Васіля Цімашова ў Палацы Рэспублікі.

Магчыма, не менш выдатных твораў з'явіцца, калі свой талент рэалізуюць тыя дзяўчаты і хлопцы, якіх падчас праекта «Мы — для дзяцей!» падахвоцілі атрымаць прафесійную адукацыю ў Гімназіі-каледжы мастацтваў.

**Галіна БАГДАНАВА**